# УПЛЫЎ ПОЛЬШЧЫ НА АДРАДЖЭННЕ КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА Ў БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ 1980-х – ПАЧАТКУ 1990-х гг.

І.І. Лубінскі (Мінск)

Каталіцкі Касцёл у Беларусі сёння – адна з найбольш уплывовых арганізацый, якая садзейнічае захаванню традыцый беларускага народа, актыўна узаемадзейнічае з дзяржавай, іншымі рэлігійнымі аб'яднаннямі, грамадскімі арганізацыямі па развіцці духоўнага багацця Беларусі. Таксама прызнаны аўтарытэт Касцёла і на міжнародным узроўні. Але гэта ўсё дасягнута за зусім кароткі адрэзак часу. Крыху больш за 20 гадоў таму назад Касцёл знаходзіўся ў вельмі цяжкім становішчы. Дзесяцігоддзі атэізацыі і перасследу веры вельмі моцна ўдарылі па каталіцтву на беларускіх землях. Перабудова, якая пачалася з сярэдзіны 1980-х гг., адкрыла шлях рэлігійнай свабодзе ў Беларусі. У новых гістарычных умовах усе хрысціянскія цэрквы атрымалі магчымасць дзейнічаць адкрыта. У мінулае паступова адыходзілі дзесяцігоддзі праследванняў і ганенняў за веру, татальнай атэістычнай прапаганды, бессэнсоўнага знішчэння храмаў.

Аднак для адраджэння духоўнага жыцця гэтага было недастаткова. Касцёлу патрэбныя былі як ніколі дзейсная дапамога і падтрымка. У гэтай сітуацыі Польскі Епіскапат адкрыта стаў дапамагаць у адраджэнні Касцёла ў Беларусі.

Пытанні дапамогі Касцёлу ў Беларусі з боку Польшчы падымаліся толькі некаторымі аўтарамі. Многія аспекты такой дапамогі можна знайсці у працах Э.С. Ярмусіка [8, 9], У.М. Завальнюка [3], І.І. Дорняка [2]. Закранаюць гэта пытанне і польскія аўтары [10, 11]. Але яшчэ застаецца шмат праблем. Існуе меркаванне, што падобная дапамога патрэбна для захавання і развіцця "польскасці" ў Касцёле, падтрымкі польскай дыяспары[4, с. 209], ёсць пазіцыя, што польскае ўмяшальніцтва стрымлівала развіццё беларускага аблічча Касцёла [3, с. 45]. Іншыя даследчыкі сцвярджаюць, што без дапамогі з боку Польшчы Каталіцкі Касцёл не дасягнуў так высокіх вынікаў, што, дзякуючы такой падтрымцы, Касцёл стаў адной з найбольш дзейсных арганізацый у Беларусі, аказвае ўплыў на сацыяльна-палітычныя працэсы ў рэспубліцы [7, с. 34]. Часам пазіцыя беларускіх улад, якія падазрона адносяцца да дзейнасці польскіх святароў у Беларусі, прымушае задумацца над значэннем польскай падтрымкі ў аднаўленні каталіцкіх структур у Беларусі.

Польская дапамога Касцёлу ў Беларусі ў савецкі час аказвалася перш за ўсё праз нелегальны ўвоз літаратуры, рэлігійных рэчаў. Пры прасавецкім камуністычным рэжыме ў Польшчы гэту дапамогу маглі аказваць практычна падпольна каталіцкія колы польскага грамадства. Актывізацыя дапамогі і выхад яе на афіцыйны ўзровень адбыліся разам з палітычнымі зменамі канца 1980-х гг. ў самой Польшчы. Актыўную ролю пачалі іграць сродкі масавай інфармацыі. З Польшчы вяліся трансляцыі рэлігійных тэле- і радыёперадач. У Беларусь пачалі завозіць шмат рэлігійнай літаратуры, далей яе прадавалі ў касцёлах і гэта садзейнічала ўмацаванню іх фінансавага становішча. Напрыклад, у 1990 годзе ад шэрагу замежных арганізацый было пастаўлена больш 54 тыс. экзэмпляраў кніг і брашур. Толькі выдавецтва Варшаўскай архідыяцэзіі перадало ў дар біскупу Тадэушу Кандрусевічу 55 тысяч экземпляраў катэхізіса. Агульная колькасць паступлення ў рэспубліку рэлігійнай літаратуры, па некаторых дадзеных, склала за год 157, 5 тыс. экземпляраў на рускай і польскай мовах [8, с. 373].

З лета 1988 г. ў Беларусь пачалі даволі часта наведвацца польскія біскупы. Першым быў ксёндз біскуп Раман Анджэеўскі з Влацлаўка. А ўжо 5 – 6 верасня 1989 г. у шэрагу касцёлаў Гродзеншчыны пабываў Прымас Каталіцкага Касцёла

Репозиторий ВГУ

Польшчы кардынал Юзэф Глемп. У Гродне, Лідзе, Навагрудку яго сустракалі тысячы вернікаў са свечкамі і кветкамі, якімі высцілалі кардыналу дарогу. Кардынал і яго супрацоўнікі раздавалі шмат кніг, ружанцаў, абразікаў. Кардынал у сваіх казаннях звяртаўся да каталікоў, праваслаўных, атэістаў са словамі міру і сяброўства паміж народамі [8, с. 375]. Візіт кардынала Глемпа стаў магутным стымулам для актывізацыі каталіцкага Касцёла, які пацвердзіў імкненне польскага Епіскапата да захаванння і ўзмацнення ўплыву на касцёлы і каталіцкае духавенства Беларусі. Пры ўсім гэтым трэба аднак улічваць час, калі адбываўся візіт Прымаса Польшчы. Захоўвалася атэістычная камуністычная сістэма, якая даволі непрыхільна ставілася да падобных візітаў. Безумоўна, палітыка перабудовы зрабіла больш адкрытым савецкае гармадства. Аднак падобныя спробы аднаўлення рэлігійнага жыцця мелі пэўнае супраціўленне з боку уладаў. Кардынал Юзаф Глемп зрабіў вельмі шмат для Касцёла ў Беларусі, і таму яго візіт выклікаў хвалю незадавальнення з боку ўлад, ў прыватнасці, Камітэта па справах рэлігій. На словы незадавальнення польскай актыўнасцю Юзаф Глемп у прысутнасці кіраўніка Праваслаўнай Царквы Філарэта, які немалым чынам паспрыяў прыезду Прымаса, заявіў, што такія візіты скончацца, калі ў Касцёла ў Беларусі з'явіцца свая структура і свае біскупы [3, с. 42].

А ўжо ў кастрычніку 1989 г. папа Ян Павел ІІ прызначыў ксяндза Тадэвуша Кандрусевіча біскупам і Мінскім Апостальскім Адміністратарам у Беларусі. Аднак пэўны час новы адміністратар павінен быў прабываць у Гродна [5, с. 224]. Новапрызначаны біскуп адразу пачаў арганізоўваць дзейнасць Касцёла ў Беларусі, прызначыў трох вікарыяў, заняўся вяртаннем і аднаўленнем святынь. У 1991 г. адбылася рэарганізацыя дыяцэзіяльных структур Касцёла ў Беларусі. Пазіцыя Рыму была такая, каб аднаўляць старажытныя структуры Касцёла [1, с. 62]. Была створана Мінска-Магілёўская дыяцэзія, аб'яднаная з асобна існаваўшых да савецкага часу, адноўлена Піская і створана Гродзенская дыяцэзіі. З'явіліся і новыя біскупы: Казімір Свёнтэк, які ў 1994 г. стаў першым беларускім кардыналам, Аляксандр Кашкевіч – біскуп гродзенскі і інш. У 1999 г. з Мінска-Магілёўскай вылучылася Віцебская дыяцэзія. Першым біскупам Віцебскім стаў Уладзіслаў Блін. Такі плён развіцця Касцёла у значнай ступені быў дасягнуты дзякуючы дзейнасці Польскага Епіскапата ў Беларусі [7, с. 34].

Для здзяйснення пастырскай дзейнасці з Польшчы была прынята вялікая колькасць ксяндзоў [9, с. 63]. Справа ў тым, што падчас высокіх візітаў біскупаў каталікі Беларусі прасілі прыслаць святароў для дапамогі ў духоўным адраджэнні. У выніку ў 1989 г. ў Маскве паміж прадстаўнікамі Польскага Епіскапата і Савета па справах рэлігій пры СМ СССР адбыліся перамовы, на якіх прынялі рашэнне у якасці пастырскай дапамогі католікам прыняць на часовую працу 50 ксяндзоў з Польшчы [10, s. 36]. Польскія святары прысылаліся і ў далейшым, беларускіх ксяндзоў не хапае да нашага часу.

Асаблівую ўвагу польскіх біскупаў выклікала сітуацыя на Гродзеншчыне, дзе Касцёл меў найбольшую падтрымку насельніцтва, была вялікая польская дыяспара. Мясцовыя органы і апарат упаўнаважанага Савета па справах рэлігій Гродзенскай вобласці не маглі спыніць дзейнасць польскага духавенства. Ішлі просьбы ў Маскву, каб аказалі уплыў на польскі Епіскапат, бо той умешваецца ў справы каталіцкага касцёла Гродзеншчыны [8, с. 377].

Аднак Польскі Епіскапат не страчваў уплыву на развіццё Касцёла ў Беларусі. Тлумачыцца гэта можа тым, што такая падтрымка выклікала таксама і развіццё польскай дыяспары. Ацэньваючы ўклад мясцовых палякаў у захаванне каталіцкіх традыцый, варта адзначыць, што, напрыклад, захаванне касцёлаў у ру-



Репозиторий ВГУ

ках вернікаў і рэлігійнага жыцця мелася перш за ўсё на Гродзеншчыны, дзе доля палякаў паводле савецкіх перапісаў насельніцтва складала больш за 20%. Гэта Гродна, Ліда, Валкавыск, Слонім, раёны вакол гэтых гарадоў [4, с. 209]. Таму Польскі бок адчуваў маральнае права падтрымаць гэтыя польскія абшчыны ў Беларусі праз дапамогу Каталіцкаму Касцёлу. Гэта садзейнічала замацаванню ў свядомасці беларусаў таго, што Касцёл у Беларусі "польскі". Да таго ж прысланыя з Польшчы ксяндзы рэдка ведалі беларускую ці рускую мовы, таму праводзілі набажэнствы, размаўлялі з парафіянамі па-польску [3, с. 45]. Ужо ў незалежнай Беларусі Старшыня Вярхоўнага Савета С.С. Шушкевіч, выказваў непакой з таго, што польская падтрымка садзейнічае таму, што "польскасць" атаясамліваецца з "каталіцкасцю" [6, с. 1].

Вясной 1990 г. было створана Таварыства касцёльнай дапамогі для каталікоў у СССР. Менавіта яно каардынавала прыбыццё святароў у Беларусь, літургічную і катэхетычную даппамогу. Вялікі ўклад у адбудову і рамонт касцёлаў аказвалі польскія прадпрымальнікі [11, s. 54]. Істотнай была дапамога польскага Епіскапата ў падрыхтоўцы кадраў каталіцкага духавенства, асабліва ў адкрытай у 1990 г. Гродзенскай вышэйшай духоўнай семінарыі.

Польскія ўплывы не абмяжоўваліся толькі Касцёлам. Шмат было зроблена для развіцця польскай дыяспары, падтрымання польска-беларускіх культурных сувязяў. У 1990-х гг. на Гродзеншчыне было адкрыта некалькі школ з пераважна польскай мовай навучання, падтрымлівалася дзейнасць Саюза палякаў на Беларусі [2, с.32]. Такая падтрымка садзейнічала і таму, што польская дыяспара актывізавалася, аказвала ўплыў на многія сферы жыцця грамадства, у тым ліку не страчвала сваіх пазіцый у Касцёле, асабліва на Гродзеншчыне. Як вынік, на сённяшні дзень можна бачыць падзел Каталіцкага Касцёла на "Гродзенскі" – польскі і Касцёл на астатняй тэрыторыі Беларусі з пераважна літургічнай беларускай мовай.

З развалам СССР і атрыманнем незалежнасці Беларусі зніклі многія перашкоды, і сувязь Касцёла ў Беларусі і Польшчы паднялася на больш высокі ўзровень. Пакуль цалкам не сфарміравалася і замацавалася структура Каталіцкага Касцёла ў Беларусі, польская дапамога была найважнейшым фактарам, што дапамагаў каталікам адраджаць разбуранае атэізацыяй рэлігійнае жыццё. Аднак далейшае развіццё Каталікага Касцёла ў Беларусі патрабуе таго, каб гэта рэлігійная арганізацыя умацоўвала веру ў беларусаў, абапіраючыся на мясцовыя традыцыі і культуру.


1. Верашчагіна, А.У. Гісторыя канфесій на Беларусі ў другой палове ХХ стагоддзя / А.У. Верашчагіна. – Мінск: ІСПД, 1999. – 136 с.
2. Дорняк, И.И. Белорусско-польское сотрудничество в области культуры, науки и образования в 1991 – 2004 гг. / И.И Дорняк. // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія. – 2008. – №3. – С. 30 – 35.
3. Завальнюк, У.М. Узняліся крыжы над святынямі / Уладыслаў Завальнюк. – Мінск: Касцёл св. Сымона і св. Алены, 1999. – 203 с.
4. Кручковский, Т.Т. Поляки на Беларуси на фоне истории и современности / Т.Т. Кручковский. – Слоним: ГО-УПП «Слонимская типография», 2003. – 272 с.
5. Роод, В. Рим и Москва в отношениях между Святым Престолом и Россией/Советским Союзом в период от Октябрьской революции 1917 г. до 1 декабря 1989 г. / Вим Роод. – Львів: Монастир монахів Студійського Уставу, 1995. – 279 с.
6. Синякевич, И. Беларусь и Польша подписали договор / И. Синякевич // Независимая газета. – 1992. – 1 июля. – С. 1 – 2.
7. Этноконфессиональные процессы в Беларуси и формирование патриотизма / А.С. Майхрович, В.И. Бовш, Е.С. Прокошина и др. – Минск: Право и экономика, 2004. – 152 с.




Репозиторий ВГУ

8. Ярмусик, Э.С. Католический костёл в Беларуси в 1945 – 1990 годах: монография / Э.С. Ярмусик. – Гродно: ГрГУ, 2006. – 567 с.
9. Ярмусик, Э.С. Римско-католическая Церковь в Беларуси в период понтификата Иоанна Павла II / Э.С. Ярмусік. // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія. – 2009. – № 1 – 2. – С. 59 – 65.
10. Dzwonkowski Roman SAC, ks. Problemy Kościoła katolickiego obrządku łacińskiego w bylym ZSRR / Roman Dzwonkowski. // Zeszyty Naukowe KUL. Rok 37. – 1994. – № 1 – 2. – S. 35 – 43.
11. Wietrzak Zdzisław Sl, ks. Kościół Katolicki w Europe Środkowo-Wschodniej / Zdzisław Wietrzak. – Kraków: Wydawnictwo WAM Księż Jezuici, 1997. – 250 s.

Репозиторий ВГУ